**23.** Выберыце спалучэнне слоў, дзе не пішацца вялікая літара.

*1) (К, к)урган Славы;     2) (Г, г)ордзіеў вузел;*
*3) (Н, н)обелеўская прэмія.*

**А)** усе спалучэнні. **Б)** няма патрэбных спалучэнняў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**24.** Які верш Янкі Купалы яшчэ да рэвалюцыі быў пакладзены на музыку, пазней перакладзены на 81 мову, а да 100-годдзя з дня нараджэння паэта быў выдадзены асобнай кнігай?

**А)** “Мужык”. **Б)** “А хто там ідзе?”. **В)** “Мая доля”.
**Г)** “Гусляр”. **Д)** “Алеся”.

**25.** Як называюцца два творы аднаго аўтара, аб’яднаныя агульнай задумай і пераемнасцю сюжэта?

**А)** раман. **Б)** п’еса. **В)** дылогія. **Г)** трылогія. **Д)** пенталогія.

**26.** Драўляная ці мураваная дэкаратыўная пабудова для адпачынку, аховы ад сонца і ападкаў – гэта … .

**А)** альтанка. **Б)** страха. **В)** вежа. **Г)** лазня. **Д)** падстрэшша.

**27.** Слова *інстытут*, як і *ўніверсітэт*, у беларускай мове ўжываецца з … .

**А)** XVI ст. **Б)** XVII ст. **В)** XVIII ст. **Г)** XIX ст. **Д)** XX ст.

**28.** Хто з вядомых класікаў беларускай літаратуры свой першы твор на беларускай мове “Пяюць начлежнікі” апублікаваў у 1910 годзе ў газеце “Наша ніва”?

**А)** А. Куляшоў. **Б)** П. Броўка. **В)** М. Танк. **Г)** З. Бядуля. **Д)** П. Трус.

**29.** У 1991 годзе ў Мінску да 100-годдзя з дня нараджэння паэта быў адкрыты Дзяржаўны літаратурны музей … .

**А)** Янкі Купалы. **Б)** Якуба Коласа. **В)** Максіма Багдановіча.
**Г)** Петруся Броўкі. **Д)** Міхала Агінскага.

**30.** Гэтага пісьменніка, гісторыка, выдаўца, ілюстратара часта называюць “пружанскім Дзюма” (дзяцінства яго прайшло каля Пружан). Творчая спадчына яго складае каля 600 прац. Яго завуць … .

**А)** Напалеон Орда. **Б)** Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.
**В)** Юзаф Крашэўскі. **Г)** Мікола Купрэеў. **Д)** Францішак Багушэвіч.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16     тэл. (017) 372 36 17, 372 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by     http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 19. Тыраж 12500 экз. г. Мінск. 2018 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2018»

*Чацвер, 15 лютага 2018 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі. У заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1,5-2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Хто з вядомых беларускіх паэтаў напісаў паэму “Новая зямля”?

**А)** Максім Багдановіч. **Б)** Янка Купала. **В)** Якуб Колас.
**Г)** Максім Танк. **Д)** Ніл Гілевіч.

**2.** Прачытайце сказ:

*Нам яшчэ трэба ўбачыць у іншых сябе, у сабе – нябёсы, у нябёсах – сонца, а ў сонцы – сонцалюдзей (А. Разанаў).*

Выберыце, да якога разраду адносіцца займеннік *нам*, ужыты ў сказе.

**А)** асабовыя. **Б)** зваротны. **В)** прыналежныя.
**Г)** указальныя. **Д)** адносныя.

**3.** Выберыце правільны адпаведнік рускага народнага выслоўя “*держать пари*”.

**А)** біць лынды. **Б)** ні даць ні ўзяць. **В)** адзін другога варты.
**Г)** ісці ў заклад. **Д)** хто яго ведае.

**4.** У народзе можна пачуць: *“Так перапужаўся, што душа … пайшла!”* Якое слова прапушчана?

**А)** у пяты. **Б)** на базар. **В)** у хату. **Г)** на страху. **Д)** з вушэй.

**5.** Выберыце правільна напісаныя спалучэнні слоў з лічэбнікамі.

*1) тры вучняў; 2) двое дзвярэй; 3) трое коней; 4) чэцвера дзяцей.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**6.** У якім(-іх) слове(-ах) з дадзеных правільна пастаўлены націск?

*1) да́лей; 2) вы́шэй; 3) су́праць.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1. **Г)** 1, 2. **Д)** 3.

**7.** Дадзены словы:

*1) шніц..ль; 2) світ..р; 3) ш..рлотка; 4) ш..рсцяны.*

Выберыце тыя словы, у якіх на месцы пропуску напішаце літару ***а***.

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**8.** Выберыце правільна напісаныя спалучэнні.

*1) без дай прычыны; 2) усё адно; 3) як след; 4) якраз; 5) хіба што.*

**А)** усе спалучэнні. **Б)** няма патрэбных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**9.** У якім сказе выдзеленае слова напісана правільна?

*1) Тут стаяў зусім незнаёмы для* ***ласяня*** *стог сена.*
*2) Сабака ляжаў каля канапы на баку і лапаю гуляў з* ***кацянём***.
*3) Аграном спыніў каня, прыўзняўся на* ***стрэмя*** *і ўважліва агледзеў поле.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма патрэбнага сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**10.** Дадзены словазлучэнні:

*1) смачн.. жэле; 2) блакітн.. шаль; 3) прасторн.. купэ; 4) утульн.. кафэ.*

У якіх словазлучэннях прыметнікі патрэбна напісаць з канчаткам ***-ы***?

**А)** ва ўсіх. **Б)** няма такіх прыметнікаў.
**В)** толькі ў 2. **Г)** у 1, 2. **Д)** у 3, 4.

**11.** Якія складаныя словы правільна напісаны?

*1) стометровы; 2) стогалосы; 3) статысячны; 4) стаградусны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**12.** Выберыце правільна напісаныя прыметнікі.

*1) французскі; 2) таварышскі; 3) казбекскі; 4) чэшскі.*

**А)** усе прыметнікі. **Б)** няма патрэбных прыметнікаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**13.** Якія прыклады з дадзеных не з’яўляюцца словазлучэннямі?

*1) крохкі лёд; 2) трыццаць два; 3) падаюць сняжынкі; 4) паміж азёр.*

**А)** усе прыклады. **Б)** усе прыклады, акрамя 1. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

**14.** Якое слова з’яўляецца тэматычна лішнім у радзе?

*Нарач, Свіцязь, Снуды, Свір, Полацк.*

**А)** Нарач. **Б)** Свіцязь. **В)** Снуды. **Г)** Свір. **Д)** Полацк.

**15.** Суаднясіце запазычаныя словы з іх адпаведнікамі ў беларускай мове.
Запазычаныя словы: *1) гарантыя; 2) кантраст; 3) вердыкт; 4) аналогія.*
Адпаведнікі ў беларускай мове: *а) падабенства; б) рашэнне; в) парука; г) процілегласць.*

**А)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а. **Б)** 1-а, 2-в, 3-г, 4-б. **В)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а.
**Г)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **Д)** 1-а, 2-г, 3-в, 4-б.

**16.** Колькі даданых частак у дадзеным складаназалежным сказе?

*Хочацца верыць, што ёсць у нашай краіне людзі, якія будуць ведаць сваё мінулае, шанаваць памяць сваіх продкаў, не дапусцяць, каб згасла гэта памяць у сэрцах многіх пакаленняў нашчадкаў.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**17.** Форму якога склону не мае зваротны займеннік *сябе*?

**А)** назоўнага. **Б)** роднага. **В)** вінавальнага. **Г)** творнага. **Д)** меснага.

**18.** Дадзены сказы.

*1) Гарачыня нясцерпная. 2) І вось жаданая спартыўная перамога.*
*3) Баяліся пакрыўдзіць словам. 4) Пад Новы год адбылося незвычайнае.*

Выберыце толькі аднасастаўныя сказы.

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**19.** Выберыце з дадзеных толькі прыметнікі складанай формы вышэйшай ступені параўнання.

*1) наймудрэйшы; 2) больш вясёлы; 3) цікавейшы; 4) менш даступны.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**20.** У якім сказе з прапанаваных няправільна падкрэслены дзейнік?

*1) <u>Дзве</u> <u>бярозкі</u> раслі на ўзлеску.*
*2) Белая <u>фарба</u> хутка закончылася.*
*3) Творчасць – вялікая <u>радасць</u>.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

**21.** У народзе гавораць: *“Каб выбіць ляноту, трэба даць работу да ... поту”.* Якога лічэбніка не хапае на месцы пропуску?

**А)** першага. **Б)** трэцяга. **В)** пятага. **Г)** сёмага. **Д)** адзінаццатага.

**22.** Хто з беларускіх мастакоў слова нарадзіўся за межамі Беларусі?

*1) І. Шамякін; 2) Я. Брыль; 3) П. Панчанка; 4) К. Чорны; 5) У. Караткевіч.*

**А)** ніхто з дадзеных мастакоў слова. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.